БЮРО
ГАЗЕТНЫХ ВЫРЕЗОК
У. Ц. П. О.
Телефон № 96-69
Газета Советская Белорусь
от 22 14 СЕН 192
г. Минск Газета №

# „Сіняя блюза“.

## (2 першыя спэктаклі).

Савєтызацыя эстрады, барацьба са старым „клясычным“ рэпэртуарам і запаўненьне яго новым злабадзённым зьместам зьяўляецца зараз баявой задачай тэатру эстрады.

„Сіняя блюза“ толькі напалову выканала гэтыя задачы. Я кажу аб першых двух спэктаклях, у якіх амаль пры адналькавай праграме, сапраўдным дасягненьнем зьяўляюцца толькі 3—4 нумары.

„Вася Курыцын едзе прыстрайвацца“ цікавы тым, што на досыць зьбітую тэму збудаваны вельмі добры вадэвіль. Надзвычайна здольны актор Тусузаў, сваёй ігрой у псыхалёгічным пляне (як ня дзіўна!) стварыў фігуру пралазьлівага і ашуканскага ханжы, які пускае ў ход усе сродкі, каб прыстроіцца „без пратэкцыі“. Вельмі добрыя інтэрмэдыйныя месцы (4 жанчыны ў перапынках паміж эпізодамі). Выключна дасьціпны нумар танцаў з пераапрананьнем. Але ён ня толькі дасьціпны. Ён поўны глыбокага сэнсу, які выяўляецца ня толькі ў тэмпэрамэнтным выкананьні танцаў, але і самая пасьлядоўнасьць іх нясе ў сабе кантрастную апраўданасьць.

Салённыя рухі японскага танцу, набліжаючага нас да манархічнай, жаманнай Японіі; імпэтныя, расхлябаныя і складаныя рухі распадаючагася Захаду і наша рэвалюцыйнае і вельмі простае „Яблочко“.

Гэты нумар ды пародыя на „клясычную“ эстраду самыя цікавыя месцы ў спэктаклі.

У „Братьях Удальцовых“ пародыруецца стары спосаб паказваць „народ“ непраходна дурнымі ёлупамі. Гэты нумар так старанна апрацаваны, што самыя дробныя рухі актораў даходзяць да гледача.

І, нарэшце, апавядальніца ды „Уборка“, якія ўяўляюць сабой мала арыгінальнага, але даюць добрае па мастацтву выкананьне. Вось тыя асноўныя і патрэбныя шляхі, па якіх ідзе „Сіняя блюза“. Але ня гледзячы на гэта, яна яшчэ знаходзіцца пад уплывам старога „клясычнага“, які яны стараюцца парадыраваць. Сьпявак Авер'янаў нікуды ня годны вельмі няўдалы і наскрозь апэрэтачны ўвесь першы нумар. Тут ня толькі „слашчавы“ тэкст у рамансным духу, але месцамі зусім бяз сэнсу („Прыказ капитана“, „Волны есть волны“), тут і музыка і ўсе рухі не абумоўлены ніякім зьместам.

Некалькі слоў аб гэройстве матросаў, вельмі недарэчы ўстаўленых яшчэ больш псуе выступленьне.

Тое-ж можна сказаць аб „сьпевах і скоках народнасьцяў СССР“, якіх няма фактычна ў нумары. Ні мовы, ні скокаў ніводнай народнасьці „Сіняя блюза“ ў сапраўднасьці не перадае.

Апошнія выступленьні яшчэ больш зьбітыя і ўжо зусім ня цікавыя.

Але тыя нумары, аб якіх гаварылася ў пачатку нашага артыкулу, дастаткова даводзяць, што ў „Сіняй блюзе“ ёсьць добра азначаны, бясумоўна, верны шлях, і трэба думаць, што ў зусім недалёкай будучыне яна адсее ўвесь непатрэбны і шкодны матар'ял, які мусіць ужо стаіць у чарзе да „адстаўкі“. У двух спэктаклях не асабліва яскрава, але ўсё-ж такі прадстаўлена будучая савецкая эстрада.

Р. Г.